■ Абмяркоўваем разам

# «ЗЯЛЁНАЯ» ДЭМАКРАТЫЯ

**Чысты транспарт, экалагічная маркіроўка і сертыфікацыя, «зялёная» навука для чыноўнікаў — чаго чакаць ад новага Нацыянальнага плана па ўкараненні прынцыпаў «зялёнай» эканомікі.**



На пачатку лістапада адбыўся грамадскі сход з мэтай абмеркавання праекта Нацыянальнага плана дзеянняў па ўкараненні прынцыпаў «зялёнай» эканомікі ў галінах народнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь да 2020 года. Спецыялісты розных сфер, грамадскія дзеячы, прадстаўнікі экалагічных арганізацый выказалі распрацоўшчыкам Нацплана свае прапановы і заўвагі накont законапраекта.

## Экалогію — ва ўсе сферы

Падчас слуханняў **Наталля ЖАРКІНА, начальнік упраўлення аналітычнай работы, дзяржаўнай палітыкі і рэгулявання ў галіне аховы навакольнага асяроддзя Мінпрыроды,** прадставіла сам праект Нацыянальнага плана дзеянняў, расказала пра ход яго падрыхтоўкі, заўвагі і прапановы, якія паступілі:

— Праграма дзейнасці ўрада на 2016—2020 гг. сярод іншага вызначае неабходнасць развіцця «зялёнай» эканомікі, індустрыі, экалагічнага транспарту. У асноўных палажэннях праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця таксама растлумачана гэтая неабходнасць. Асноўнымі каардынатарамі сённяшняга праекта з'яўляюцца Мінпрыроды, Мінэканомікі і НАН Беларусі. Была створана міжведамасная рабочая група, у якую ўвайшлі прадстаўнікі дзяржаўных органаў, некаторых грамадскіх аб'яднанняў і навукоўцы. На пасяджэнні прадставілі план-праект, які будзе дапрацаваны з удзелам грамадскасці.

На восьмай канферэнцыі міністраў аховы навакольнага асяроддзя, якая адбылася ў гэтым годзе ў Батумі, Беларусь выказала гатоўнасць да выканання добраахвотных абавязкаў, накіраваных на стварэнне і развіццё інфраструктуры, «зялёнага» грамадскага гарадскога транспарту, прававых асноў па вядзенні арганічнай сельскай гаспадаркі, экалагічнай маркіроўцы тавараў, экалагічнай сертыфікацыі, сістэм кіравання навакольным асяроддзем, экалагічных стандартаў. Наша краіна пайшла па шляху экалагізацыі эканомікі. Мы павінны спыніць дэградацыю навакольнага асяроддзя і адначасова павялічыць дабрабыт насельніцтва. Для гэтага неабходна распрацаваць свой механізм дзеяння, вызначыць выразныя крытэрыі «зялёнай» эканомікі.

Наталля Іванаўна асобна звярнула ўвагу на сістэму «зялёных» закупак прадуктаў, якая загадвае набываць прадукты харчавання, тэхніку, канцтавары, паперу, тавары для рамонту, а таксама бытавую хімію з самымі лепшымі экалагічнымі характарыстыкамі. «Зялёныя» закупкі дапамагаюць клапаціцца пра здароўе людзей і стымулююць вытворчасць і спажыванне экапрадукцыі, зніжаючы ўздзеянне на навакольнае асяроддзе. Перавага аддаецца таварам з другаснай сыравіны або тым, якія можна перапрацаваць, а таксама прадукцыі з экамаркіроўкаю. На жаль, прадстаўнікі Мінгандлю на сходзе адсутнічалі. Пытанне засталося адкрытым. *(sic: Мінгандлю — see note)*

Адна з прапаноў аўтараў Нацплана: распрацаваць механізм, дзякуючы якому прадпрыемствы змаглі б атрымаць добраахвотны сертыфікат экалагічнай нейтральнасці. У далейшым ён можа быць выкарыстаны як абавязковы сертыфікат прадукцыі на міжнародным рынку, бо для яго атрымання неабходна выканаць шэраг патрабаванняў, якія знізяць антрапагеннае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе. Спадарыня Жаркіна таксама адзначыла неабходнасць развіцця электратранспарту ў краіне (наладзіць выпуск электробусаў — змешаны варыянт электрамабіля і аўтобуса — будучы прадукт «Белкамунмаша»). Закранула яна і тэму арганічнай сельскай гаспадаркі, заўважыла, што Мінсельгасхарч марудна падыходзіць да распрацоўкі юрыдычных аспектаў гэтага кірунку. У 2017 годзе ў краіне павінен з'явіцца закон аб арганічнай сельскай гаспадарцы, без прыняцця якога пакуль цяжка гаварыць пра падзаконныя механізмы і рабіць тыя ці іншыя высновы.

Нацплан прадугледжвае правядзенне інфармацыйных і адукацыйных мерапрыемстваў: плануецца ўвесці курс лекцый сярод чыноўнікаў праз Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Гэтай восенню ўжо стартаваў курс лекцый па «зялёнай» эканоміцы ў Беларускім эканамічным універсітэце.

Прысутныя дапоўнілі раздзелы праекта Нацплана практычнымі заўвагамі, а таксама заўвагамі рэдакцыйнага характару. Наталля Жаркіна выказала ўдзячнасць усім, хто прымаў удзел у абмеркаванні. Тым не менш яна нагадала, што неабходна ўлічваць канчатковую згоду — прапанову ў далейшым могуць і не прыняць.

Пасля грамадскіх абмеркаванняў заканатворцы селі за «круглы стол»: быў праведзены аналіз вопыту абмеркаванняў і спробы знайсці магчымыя шляхі яго ўдасканалення.

## Слова — грамадскасці

У час слуханняў спецыялісты таксама правялі семінар па забеспячэнні эфектыўнага ўдзелу грамадскасці ў прыняцці экалагічна значных рашэнняў у нашай краіне на практычным прыкладзе — на праекце Нацыянальнага плана дзеянняў па ўкараненні прынцыпаў «зялёнай» эканомікі.

**Па словах Таццяны ЕЎДАСЁВАЙ, начальніка аддзела інфармацыі і сувязяў з грамадскасцю Мінпрыроды,** 1 ліпеня 2016 года пачаў дзейнічаць Закон Рэспублікі Беларусь ад 24.12.2015 №333-З «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя і ўдзелу грамадскасці ў прыняцці экалагічна значных рашэнняў», у прыватнасці артыкул 15-2 «Грамадскія абмеркаванні праектаў экалагічна значных рашэнняў, справаздач аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе». Згодна з гэтым законам, механізм удзелу грамадскасці прадугледжвае: уцягванне грамадскасці на раннім этапе, інфармаванне грамадскасці належным чынам, разумныя тэрміны ўдзелу грамадскасці, забеспячэнне доступу да інфармацыі аб магчымасцях удзелу, доступ да інфармацыі, што тычыцца пытанняў, якія абмяркоўваюцца, забеспячэнне магчымасці прадстаўлення прапаноў і заўваг, доступ да інфармацыі аб канчатковым рашэнні.

Да пачатку сходу па абмеркаванні праекта Нацплана быў створаны «Збор заўваг і прапаноў па праекце ад прыватных асоб і арганізацый». Арганізатары адзначылі актыўны ўдзел у распрацоўцы дакумента ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў».

## База шкодных выкідаў

**Марына ЯНУШ, член сакратарыята Орхускай канвенцыі Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН,** адзначыла неабходнасць стварэння цэнтралізаваных парталаў па абнародаванні экалагічнай інфармацыі з прадпрыемстваў. Вялікі вопыт у распрацоўцы падобных інтэрнэт-рэсурсаў маюць ЕС, Рэспубліка Малдова, спецыялізаваныя сайты існуюць у Славакіі, Румыніі. Такія парталы з інфармацыяй па пытаннях навакольнага асяроддзя зробяць экалагічную інфармацыю больш даступнай, дазволяць прыцягнуць да грамадскіх абмеркаванняў вялікую колькасць удзельнікаў. Акрамя таго, будзе распрацавана і абнародавана база даных аб выкідах забруджвальнікаў, інфармацыя аб некаторых вытворчых працэсах на прадпрыемствах (пры гэтым нельга забываць пра правы прадпрыемстваў на канфідэнцыяльнасць інфармацыі, якая датычыцца спосабаў вытворчасці).

**Каардынатар міжнародных праектаў БелНДЦ «Экалогія» Іван НАРКЕВІЧ** адзначыў адказнасць цэнтра ў распрацоўцы тэхнічнай дакументацыі інтэрнэт-праекта.

— Мы павінны стварыць нацыянальны рэестр, даступную базу даных, якая будзе змяшчаць інфармацыю з прадпрыемстваў. Іншымі словамі, кожны чалавек зможа атрымаць звесткі аб выкідах з суседняга завода.

Апрача таго, ідэя сходу — мадэльнае слуханне. Напрыканцы мы створым модульны дакумент, які дасць аснову ўсім наступным слуханням. Такі сход — унікальны для навукоўцаў, юрыстаў, эканамістаў, экалагаў не толькі Беларусі, але і ўсяго свету.

**Вольга ПРАЛЮК.**
*pralyuk@zviazda.by*

■ Далучайцеся!

# Паспрабуйце пачаць з сябе

## Як «Экастарт» змяняе жыццё: гісторыі выпускнікоў

**У гэтым годзе маладзёжны экалагічны цэнтр «Экастарт» адзначыў свой юбілей. На працягу пяці гадоў Цэнтр экалагічных рашэнняў праводзіць курсы для тых, хто неабыякавы да экалагічных праблем і хоча зрабіць свой побыт больш «зялёным».**




Кожны год у сярэдзіне кастрычніка праходзіць набор у «Экастарт». Каб стаць удзельнікам, неабходна запоўніць анкету, па якой арганізатары ацэняць матывацыю жадаючых. На працягу сямі месяцаў праводзяцца заняткі для тых, хто прайшоў адборачны тур.

Вучоба для пятага набору пачалася ў лістападзе. З 91 заяўкі было прынята 47. Для параўнання: у 2014 годзе група складалася ўсяго толькі з 23 чалавек.

— З кожным годам да нас прыходзіць усё больш заявак, адпаведна, і адбіраць цяжэй, — расказала **Марыя РУДЗЬ (на фота), каардынатар і былая студэнтка «Экастарта».** — Мы стараемся даць шанц большай колькасці чалавек, таму і групы растуць. Радуе, што многія ўжо знаёмыя з экалагічнымі праблемамі. І наша школа для іх — гэта магчымасць знайсці аднадумцаў і рэалізаваць запланаваныя праекты. У гэтым годзе да нас хацеў прыйсці вучаніца хлопец пятнаццаці гадоў, у якога быў план па выратаванні возера. На жаль, мы не можам прымаць непаўналетніх. Але, спадзяёмся, ён не страціцца і захавае сваё жаданне рабіць навакольны свет лепшым.

Вопыт мінулых гадоў даказвае, што «Экастарт» цікавы як для тых, хто толькі пачынае спасцігаць асновы экалагічнай тэматыкі, так і для тых, хто імкнецца весці экалагічны лад жыцця. Акрамя лекцый па водных рэсурсах, энергазберажэнні, адходах і шматлікіх іншых тэмах, удзельнікаў чакаюць экскурсіі, майстар-класы, цікавыя заданні. Таксама кожны студэнт мае магчымасць рэалізаваць уласны экалагічны праект.

— Экалогія для мяне — гэта паважлівае стаўленне да месца, дзе ты жывеш, і да самога сябе. Я думаю, што ніхто не захоча прыходзіць у дом, дзе паўсюль смецце і пыл. Ніхто не захоча і сам быць у гразі. Нават калі чалавеку ўсё роўна, у якім стане планета, яму ніколі не будзе ўсё роўна, у якім стане яго знешнасць. А без разумення экалагічнага ладу жыцця немагчыма быць прыгожым ні звонку, ні знутры. Зараз мае веды ў галіне экалогіі павярхоўныя. Таму я чакаю ад «Экастарту» карысных ведаў, якімі змагу карыстацца сама і перадаваць іншым, — падзялілася меркаваннем **Анастасія ХРЫШЧАНОВІЧ, новая ўдзельніца «Экастарту».**

«Экастарт» змяняе жыццё», — сцвярджаюць студэнты мінулых гадоў. Мы даведаліся ў выпускнікоў, якімі яны былі да школы і што змянілася пасля, які праекты ім удалося рэалізаваць.

**Карына МАЛІНОЎСКАЯ, праект «Экалагічныя майстэрні для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі»,** працуе з прыхільнікамі Цэнтра экалагічных рашэнняў:

— Да «Экастарту» мяне цікавілі больш глабальныя праблемы. Пасля яго я зразумела, што трэба пачаць з сябе. Людзі, якія думаюць, што адзін чалавек нічога не можа, памыляюцца. Такая простая рэч, як сартаванне смецця дома, — патрэбная і карысная справа. Акрамя ЦЭРа, я была валанцёрам і ў дзіцячым хоспісе, таму мне прыйшла ідэя арганізаваць экалагічныя мерапрыемствы для гэтых дзетак і шматдзетных сем'яў. Пры дапамозе Цэнтра экалагічных рашэнняў праект быў паспяхова рэалізаваны.

**Павел КОЎШАЛЬ, арганізатар экапунктаў на розных фестывалях:**

— На «Экастарт» я прыйшоў з мэтай разабрацца ў экалагічных праблемах, аб якіх меў павярхоўнае ўяўленне. І атрымаў неабходныя веды. Але галоўнае — «Экастарт» дапамог зразумець, у якім кірунку я хачу рухацца далей. Акрамя гэтага, я пазнаёміўся з вялікай колькасцю аднадумцаў. А хто яшчэ можа натхніць на новыя актыўнасці? Вядома, «Экастарт» змяніў маё жыццё. Спачатку было вельмі цяжка псіхалагічна. Пастаянна трапляліся на вочы «экаграхі», якія шкодзяць нашай планеце. Але складаней было бачыць іх нават не ў іншых людзях, а ў сабе. Прыйшлося шмат ад чаго адмовіцца. Аднак паступова прыйшло філасофскае стаўленне: немагчыма ўсё змяніць у адно імгненне, трэба ісці маленькімі крокамі. Думаю, з часам людзі зразумеюць, як трэба ставіцца да прыроды, а мы, экаактывісты, павінны ім у гэтым дапамагчы. Адсюль і мой праект — экапункты. Я хачу, каб людзі на розных фестывалях, святах не толькі адпачывалі, але і атрымлівалі карысную інфармацыю.

**Лізавета РАМАНОЎСКАЯ, арганізатар «ВелаЭкаКвэста-2»:**

— Пра «Экастарт» я даведалася на першым «ВелаЭкаКвэсце», дзе нас пазнаёмілі з экалагічнымі арганізацыямі Мінска. Маладзёжны цэнтр даў мне неабходную інфармацыю і сродкі для рэалізацыі задуманага праекта «ВелаЭкаКвэста-2». Ён праходзіў у прамысловым раёне Шабаны. Мае аднагрупнікі дапамаглі прыдумаць заданні і правесці гэтае мерапрыемства. «Экастарт» напоўніў маё жыццё яркімі падзеямі: «зялёныя» Каляды, выпускны на казінай ферме. Калі вас цікавіць насычанае жыццё — не прапусціце такую магчымасць, станавіцеся ўдзельнікамі «Экастарту»!

***Калі вы не паспелі падаць заяўку на «Экастарт» у гэтым годзе, то ў вас ёсць шанц стаць удзельнікам маладзёжнага адукацыйнага цэнтра ў наступным. «Экастарт» можа змяніць і ваша жыццё!***

**Кацярына КІРЭЕВА**